Беларуская мова. 2 клас

Астроўская Святлана Аляксееўна,

настаўнік ДУА “Сярэдняя школа №15 г. Барані”

**Тэма:** Падоўжаныя зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме.

**Мэта:** назіранне за вымаўленнем і напісаннем падоўжаных зычных гукаў.

**Задачы ўрока:**

1. Пазнаёміць з перадачай на пісьме падоўжанага гука дз; фарміраваць уменне запісываць пад дыктоўку словы з падоўжанымі зычнымі.
2. Узбагачаць слоўнікавы запас вучняў словамі лексіка-семантычнай группы “дзікія жывёлы”.
3. Расвіваць фанематычны слых, мысленне, памяць вчняў.
4. Выхоўваць любоў да прыроды роднага края.

**Абсталяванне:** падручнік “Беларуская мова. 2 клас” В. І. Свірыдзенка, мультымедыйная прэзентацыя, карткі з заданнямі для парнай работы, карткі з выявай ладдзі.

**Ход урока**

I. Арганізацыйны момант (Слайд 1)

Над бярозай – белы бусел, пад бярозаю – ручай.

А завецца Беларуссю непаўторны родны край.

II. Актуалізацыя ведаў (Слайд 2)

Лянок і Васілінка запрашаюць нас у падарожжа па Беларусі. Прачытайце назвы беларускіх весак, праз якія пралягае наш маршрут: Залессе, Замошша, Забалацце, Заполле, Зарэчча. (Слайд 3)

- Што агульнае вы заўважылі ў гэтых назвах? (падоўжаныя зычныя)
- Якія яшчэ словы з падоўжанымі зычнымі вы ведаеце?

III. Паведамленне тэмы і задач урока

Тэма урока: Падоўжаныя зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме. (Слайд 4, 5)

- Якія зычныя ў беларускай мове могуць вымаўляцца падоўжана? Як яны запісваюцца?
- Падумайце, што мы будзем рабіць сёння на ўроку? Чаму вучыцца?

  Задачы ўрока

  1. Вучыцца вымаўляць і пісаць словы з …
  2. Вучыць новыя словы з …

IV. “Заданні ад вавёркі” с вёскі Залессе. (Слайд 6)

- Раскрыйце сакрэт назвы вёскі Залессе.
- Заданні ад вавёркі

  1) Устаўце прапушчаныя літары, прачытайце словы.

     адзе**нн**е

     збо**жж**а

     зада**нн**е

     жы**цц**ё

     га**лл**ё

  2) Злучыце словы з першага і другога слупка так, каб атрымаліся словазлучэнні (работа ў парах).

     Картка 1

     залатое збожжа

     тонкае галлё

     чыстае адзенне

     цікавае заданне

     доўгае жыццё

  3) Утварыце аднакарэнныя словы з падоўжанымі зычнымі вусна:

| | |
|---|---|
| колас – калоссе | корань – карэнне |
| навокал - наваколле | вулей – вуллі |
| збажына – збожжа | камень – каменне |
| жыць – жыццё | галінка – галлё |
| весела – вяселле | багаты – багацце |

Прачытайце словы, працягла вымаўляючы падоўжаныя зычныя. (Слайд 7)

V. Засваенне новых ведаў. Знаёмства з новымі словамі

А мы ідзем далей. Але што гэта? Снег растаў і пачалося разводдзе. (Слайд 8)

- Які падоўжаны гук вы чуеце у слове “разводдзе”?
- Як ён абазначаецца на пісьме?

Заданне ад бусліка з вёскі Зарэчча. (Слайд 9)

- Пальчыкавая гімнастыка

Буслік, буслік, падкажы.
Нам пісаць дапамажы.
Ты нам крыллем памашы.
Памашы нам левым,
Памашы нам правым.
Шлях цікавы ўкажы.

- Хвіілінка чыстапісання

*Дз дз ддз дзе ддзе*

*вада вадзіца разводдзе*

*Вясенні разліў вады – гэта разводдзе.*

- Практыкаванне “Заданне ад бусліка” з вёскі Зарэчча

1) Знайдзіце словы з падоўжаным зычным дз’, падкрэсліце спалучэнні ддз (работа ў парах).

Картка 2

Мядзведзь, суддзя, дзядуля, ладдзя, дзяцел, жыццё, стагоддзе, паўгоддзе, рэдзька, багацце.

- Узаемаправерка.
- Правіла ст. 55.

Закончы сказы (Слайд 10 - 15)

Па Дняпру плыве … (ладдзя).

Мой дзядуля – народны … (суддзя).

100 гадоў – гэта … (стагоддзе).

6 месяцаў – гэта … (паўгоддзе).

Слон і … (ладдзя) - шахматныя фігуры.

- Якое многазначнае слова вы сустрэлі?
- Запіс сказаў пад дыктоўку настаўніка:

*Па Дняпру плыве ладдзя. Слон і ладдзя - шахматныя фігуры.*

**Хвілінка адпачынка**

Раз, два – спіць сава
У высокім дупле
На пуховым крыле.
Тры, чатыры – гэтак шчыра
Па сцяжынцы мышанятка
Коціць спелае зярнятка.
Пяць, шэсць – у норку лезь.
Як убачыць соўка,
Схопіць мышку лоўка.

Сем, восем – хутка восень,
А за восенню снягі
Намятуць свае стагі.
Дзевяць, дзесяць – свеціць месяц.
Мышка ціхенька ў кутку
Меле зерне на муку.
Папрацуе яшчэ – нам аладак
напячэ.

VI. Кантроль і прымяненне ведаў на практыцы

На мохавых балотах каля вёскі Замошша часта бачаць зуброў. (Слайд 16)

- Работа з падручнікам пр. 98.
- Устаўце ў тэкст словы, прачытайце тэкст.
- Спішыце сказ, у якім гаворыцца пра магутнасць і велічнасць зубра.
- Падкрэсліце знаёмые арфаграмы.
- Узаемаправерка.

VII. Рэфлексія. Падвядзенне вынікаў. (Слайд 17)

- Якія словы вы вучыліся вымаўляць і пісаць?
- Якія новыя словы з падоўжанымі зычнымі вы запомнілі?
- Запішыце іх на ветразі ладдзі і падарыце свайму сябру.



VIII. Дамашняе заданне.

- Выконваючы дамашняе, заданне вы працягнеце знаёмства з новымі словамі з падоўжанымі зычнымі.
- Пр. 101.